**С. М. Якуба**

## Тэсціраванне як сродак экспрэс-кантролю у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі філолагаў

Сучасны адукацыйны працэс наладжваецца на аснове выкарыстання разнастайных сродкаў кантролю, якія дазваляюць ажыццяўляць адваротную сувязь пры навучанні. Разнастайныя спосабы дыягнастычнай дзейнасці даюць магчымасць выявіць лакуны ў засваенні тэарэтычнага матэрыялу, вызначыць ступень сфарміраванасці лінгвістычных, моўных і маўленчых уменняў і навыкаў студэнтаў і на аснове атрыманых вынікаў удасканаліць вучэбна-выхаваўчы працэс. У межах падрыхтоўкі студэнта-філолага найбольш пашыраны такія сродкі кантролю як вуснае апытванне (на практычных занятках, у час правядзення калёквіуму і прамежкавага заліку, у час экзаменаў) і розныя віды пісьмовых работ (навучальныя і кантрольныя дыктанты, кантрольныя і лабараторныя работы, заданні з прымяненнем метадаў праграмаванага кантролю і інш.). Сярод вышэйпамянёных сродкаў кантролю вялікая роля адводзіцца тэсціраванню, значэнне якога на сучасным этапе гуманізацыі і стандартызацыі вышэйшай адукацыі значна ўзрастае. Сапраўды, у апошнія гады тэст як адзін з найбольш аператыўных і зручных сродкаў кантролю прымяняецца дастаткова шырока для праверкі ўзроўню падрыхтаванасці студэнтаў па беларускай мове. Аднак цікавасць да гэтага сродку кантролю нельга патлумачыць толькі яго асноўнай функцыяй. Як адзначалася вышэй, пададзенае ў сістэме, тэсціраванне можа служыць і сродкам дыягностыкі цяжкасцей у засваенні моўнага матэрыялу, і сродкам прагназавання паспяховасці ці непаспяховасці навучання, што дазваляе меркаваць пра ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі студэнта-філолага.

Хоць тэсціраванне даўно ўвайшло ў практыку навучання ў ВНУ, варта адзначыць, што на сённяшні дзень распрацоўка, праектаванне, апрабацыя, укараненне тэстаў з’яўляецца да канца не вырашанай задачай. Перад вучонымі паўстае шэраг пытанняў, на якія сёння няма адназначнага адказу. Адно з іх: тэст з дыдактычнага пункту гледжання форма, сродак ці метад? На думку тэстолагаў, каб пазбегнуць недакладнасці і супярэчлівасці, мэтазгодна разглядаць гэта паняцце ў вузкім і шырокім сэнсе слова. У вузкім разуменні тэст можна кваліфікаваць і як метад, і як сродак, і як форму кантролю, а ў шырокім -- гэта сродак, таму што паняцце “ахоплівае ўвесь інструментарый, што з’яўляецца сувязным звяном паміж мэтай і вынікам псіхолага-педагагічнай дзейнасці і аб’ядноўвае ў сабе разнастайныя метады, формы, прыёмы ”[2, с. 15].

Што да зместу паняцця “тэст”, то большасць вучоных пагаджаецца з думкай, паводле якой у склад паняцця павінна ўваходзіць як мінімум тры ўзаемазвязаныя кампаненты: 1) сістэма заданняў, 2) дакументальна зафіксаваная тэхналогія падачы матэрыялу, 3) адпрацаваная сістэма праверкі, апрацоўкі і аналізу вынікаў [4, с.50]. Адсюль тэст -- “кароткае,

строга стандартызаванае выпрабаванне, якое дазваляе колькасна выразіць вынік, і, значыць, дае магчымасць ажыццявіць яго матэматычную апрацоўку” [2, с. 15]. Даючы больш падрабязную характарыстыку, А. В. Дробатава кваліфікуе тэст як “стандартызаваную сукупнасць пытанняў, пададзеных падыспытнаму з мэтай кваліметрычнага выяўлення дасягнутага ім узроўню ведаў, уменняў і навыкаў, якая характарызуецца фармалізацыяй адказаў падыспытных, вылучэннем таго, што нясе асноўную інфармацыйную нагрузку і арыентавана на паскарэнне і аб’ектывізацыю іх далейшага аналізу, апрацоўкі і інтэрпрэтацыі” [3, с. 15].

Такое неадназначнае разуменне паняцця “тэст” і пэўныя тэрміналагічныя недакладнасці дазваляюць выкладчыкам у якасці названага сродку кантролю выкарыстоўваць нескладаныя пісьмовыя работы, кантрольна-трэніровачныя практыкаванні, анкеты, табліцы і інш. Аднак тэст нельга атаясамліваць з рознымі відамі пісьмовых работ, бо ў яго аснове — “спецыяльна падрыхтаваны і апрабаваны набор заданняў, якія дазваляюць аб’ектыўна і надзейна ацаніць даследуемыя якасці на аснове выкарыстання статыстычных метадаў”[4, с. 33].

Для выкладчыка беларускай мовы найбольш актуальныя так званыя педагагічныя тэсты (тэсты дасягненняў, тэсты паспяховасці і інш.), накіраваныя на праверку ведаў, сфарміраванасць уменняў і навыкаў у пэўнай катэгорыі студэнтаў. На думку В. П. Бяспалькі, такія тэсты складаюцца з кантрольнага задання і эталона, адносна якога можна меркаваць пра якасць засваення пэўнай дзейнасці [1]. Такім чынам, у практыцы навучання студэнтаў-філолагаў тэсты паспяховасці разглядаюць як комплекс пытанняў і заданняў, з’арыентаваных на вымярэнне ступені засваення пэўнага вучэбнага матэрыялу (раздзела курса, сістэматычнага курса беларускай мовы і інш.), пройдзенага за пэўны тэрмін навучання (семестр, навучальны год і інш.).

З вышэйадзначанага вынікае, што ў адпаведнасці з мэтамі навучання вылучаюць і розныя віды педагагічных тэстаў. Да прыкладу, паводле этапаў навучальнага працэсу адрозніваюць уваходны (пачатковы, уступны), прамежкавы і выходны (заключны) тэсты, а паводле зместу матэрыялу – тэматычны (па асобных тэмах ці раздзелах) і выніковы (па ўсёй вучэбнай праграме курса). Уваходнае тэсціраванне дазваляе вызначыць узровень ведаў студэнта на пачатковым этапе навучання. Напрыклад, перад вывучэннем раздзела "Марфалогія" мэтазгодна правесці тэст на выяўленне ўзроўню астаткавых ведаў студэнтаў з тым, каб засяродзіцца на складаных пытаннях тэорыі і практыкі. Прамежкавае тэсціраванне ажыццяўляецца пасля таго, як пройдзены пэўны аб’ём вучэбнага матэрыялу (напрыклад, адна тэма), і забяспечвае паэтапны кантроль засваення вывучанага. Менавіта такія тэсты мэтазгодна выкарыстоўваць у працэсе кантролю за самастойнай работай студэнтаў з мэтай дыягностыкі іх ведаў, уменняў і навыкаў. Звычайна для самастойнага вывучэння прапануецца невялікі аб’ём матэрыялу, таму кантроль за засваеннем ведаў і ўменняў на гэтым этапе навучання

ажыццяўляецца на аснове тэставых заданняў, што ўсебакова ахопліваюць абмежаваную вобласць лінгвістычных ведаў. Дыягнастычны тэст дазваляе вызначыць цяжкасці ў засваенні новага матэрыялу, таму з мэтай далейшай каардынацыі працы студэнтаў ўвага засяроджваецца на найбольш распаўсюджаных моўных і маўленчых памылках і прабелах у засваенні тэарэтычнага матэрыялу. З прычыны таго, што дыягнастычныя тэсты з’яўляюцца навучальнымі, сістэма заданняў, прапанаваная ў іх, не вызначаецца павышынай ступенню цяжкасці, чаго нельга сказаць пра выніковыя тэсты, якія кваліфікуюцца як кантрольныя і накіраваны на праверку выходных ведаў, на вызначэнне ўзроўню валодання прадметам у канцы пэўнага курса.

У сучаснай метадычнай літаратуры дастаткова шырока пададзены патрабаванні да тэста. Так, на думку вучоных, асноўнымі крытэрыямі эфектыўнага тэста з'яўляюцца валіднасць, надзейнасць, стабільнасць і аб'ектыўнасць [5, с.4]. Пад валіднасцю разумеем адпаведнасць тэста зместу і мэтам навучання. Яго надзейнасць і стабільнасць вызначаецца ў першую чаргу ўзроўнем тэставых заданняў, якія павінны быць аднамернымі (у межах адной вучэбнай дысцыпліны), мець дакладную і выразную фармулёўку, выключаць няпоўны ці альтэрнатыўны адказ. Адзін з асноўных паказчыкаў аб'ектыўнасці тэста -- правільная ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, якая дасягаецца а) дастаткова вялікай колькасцю тэставых заданняў, што дазваляюць ахапіць значны аб'ём пройдзенага матэрыялу; б) магчымасцю правесці дэталёвы аналіз вывучанага матэрыялу; в) стандартызацыяй адзнакі, яе залежнасцю толькі ад колькасці правільна выкананых заданняў, а не ад суб'ектыўных меркаванняў выкладчыка.

Асновай тэстаў з’яўляюцца тэставыя заданні. Традыцыйна усе яны падзяляюцца на заданні адкрытага і закрытага тыпу. Заданні адкрытага тыпу дазваляюць студэнту свабодна выкладаць свае думкі па сутнасці пытання або дапаўняць і пашыраць прапанаваныя фармулёўкі. Напрыклад, "Закончыце фармулёўку: "Сінтэтычная форма вышэйшай ступені параўнання прыметніка ўтвараецца...", "Парадыгма -- гэта..." і інш.” Да заданняў адкрытага тыпу таксама адносяцца і такія:

***Дайце характарыстыку адносным прыметнікам паводле наступных прымет***

| | |
|---|---|
| *семантычныя* | |
| *граматычныя* | |
| *словаўтваральныя* | |

Заданні вышэйпамянёнага тыпу дастаткова шырока прымяняюцца ў практыцы навучання філолагаў з мэтай праверкі не толькі моўнай, а і маўленчай кампетэнцыі студэнтаў.

Заданні закрытага тыпу ў практыцы навучання пададзены дастаткова шырока. У першую чаргу да іх адносяцца тыя, якія патрабуюць альтэрнатыўных адказаў (“так”, “не”). Такія заданні дастаткова лёгкія для

студэнтаў, таму практыка іх выкарыстання не вызначаецца шырокім дыяпазонам. Гэта заданні на вызначэнне правільнасці/няправільнасці выказвання. Напрыклад,

| | |
|---|---|
| **Граматычныя значэнні існуюць у адзінстве з лексічным.** | **так, не** |
| **Назоўнік мае словазменную катэгорыю роду.** | **так, не** |
| *Кароткія прыметнікі ўжываюцца ва ўсіх стылях маўлення.* | *так, не* |
| *Сцягнутыя формы прыметнікаў выступаюць у ролі азначэння.* | *так, не* |
| *Займеннікі ўказваюць на кампаненты маўленчага акта і прадметы з пазіцыі моўцы.* | *так, не* |

Наступная група -- заданні множнага выбару, якія арыентуюць на выбар сярод прапанаваных адказаў правільных. Да прыкладу,

*Канчатак -у маюць назоўнікі ў словазлучэннях: 1) святло Месяц...; 2) пераможца конкурс...; 3) падобны з твар...; 4) на юбілеі... універсітэт...; 5) пры таленавітым прафесар...*

Дастаткова пашыраны заданні на ўзнаўленне адпаведнасці, калі да слоў, словазлучэнняў, устойлівых выразаў з правага слупка падбіраюцца адпаведныя з левага. Напрыклад,

***Падбярыце да рускіх фразеалагізмаў адпаведныя беларускія. Суадносныя пары пазначце лічбамі.***

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *довести до ручки* | *1* | *гарох з капустаю мяшаць* | *1 — 3* |
| *2* | *несолоно хлебавши* | *2* | *маладзіца як брусніца* | *2 — 4* |
| *3* | *нести вздор* | *3* | *да абуха дабіць* | *3 — 1* |
| *4* | *кровь с молоком* | *4* | *круп шылам наеўся* | *4 — 2* |

У практыцы складання тэстаў дастаткова шырока выкарыстоўваюцца заданні на ўзнаўленне паслядоўнасці. Да заданняў такога тыпу адносіцца: *"Запішыце словы ў форме словаўтваральнага ланцужка: пажаўцець, пажаўцелы, жоўты, жаўцець"* і падобныя.

Разам з тым у сістэме падрыхтоўкі студэнта-філолага выкарыстоўваюцца і заданні, тыповыя для псіхалагічных тэстаў. Гэта заданні на знаходжанне аналогіі, на выключэнне лішняга, на ўменне класіфікаваць, супастаўляць і параўноўваць моўныя з'явы. Напрыклад,

**1. Да якіх часцін мовы адносяцца выдзеленыя словы?**

1. *І выгнута рэчка падковай, **што** некалі продак згубіў.* (Ю. Свірка.)__________

2. *Не папракай, **што** я кахаю, не папракай, **што** я люблю* (Н. Гілевіч.)___________

3. *І час настае, **калі** між вішнякоў і чарэшняў заканчваецца на зямлі сонечная песня.* (А. Лойка)_________

1. *Што рабіць, дарагія, з вышываным абрусам, — **калі** ёсць Беларусь, а няма беларуса.* (А. Лойка.)____________

**2. Падкрэсліце неадушаўлёныя назоўнікі.**

Трафарэт, асіна, камедыёграф, лялька, шчупак, лясун, бакалаўр, натоўп, робат, марыніст, тапелец, чарвяк, сялянства.

**3. Вызначце, да якога тыпу скланення адносяцца назоўнікі.**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Асіповічы* | | *канвенцыя* | | *Дняпро* | |
| *вятрыска* | | *гіяцынт* | | *зацішша* | |
| *клішэ* | | *перыферыя* | | *бярэмя* | |
| *племя* | | *духі* | | *вартавы* | |

**4. Лічэбнікі простыя (1), складаныя (2) ці састаўныя (3)? Вытворныя (а) ці невытворныя (б)?**

| | | | |
|---|---|---|---|
| дзевятнаццаць | | шосты | |
| семсот | | чацвёра | |
| дзвесце дваццаць | | адна трэцяя | |
| сорак | | | |

Найбольш складанымі лічацца тэсты, у якіх слоўны, лічбавы і графічны матэрыял падаецца ў спалучэнні з рознымі спосабамі фармулёўкі і рэпрэзентацыі заданняў. Менавіта такія тэсты прымяняюцца ў практыцы выкладання беларускай мовы ва універсітэце, таму што яны актывізуюць думку студэнтаў, прымушаюць выконваць заданні не механічна, а ўдумліва, аналізуючы, параўноўваючы і супастаўляючы моўны матэрыял, арыентуюць на разважанні і абагульненні, на праверку не толькі моўнай, а і маўленчай кампетэнцыі.

Як паказвае практыка навучання, тэсціраванне шырока выкарыстоўваецца ў сістэме падрыхтоўкі студэнта-філолага і мае шэраг пераваг над іншымі сродкамі кантролю. Да іх варта аднесці нескладанасць арганізацыі і аператыўнасць правядзення тэставага апытання, магчымасць за кароткі тэрмін выявіць ступень падрыхтаванасці вялікай колькасць студэнтаў па значным аб'ёме лінгвістычнага матэрыялу. Стандартызаваная падача заданняў, якая патрабуе фармалізацыі адказаў, і наяўнасць эталону адказу забяспечваюць аб'ектыўнасць ацэнкі і зручнасць апрацоўкі вынікаў тэсціравання, даюць магчымасць колькасна ацаніць якасць ведаў.

Разам з тым у якасці недахопаў тэставага апытання можна назваць празмерную стандартызацыю тэстаў, наяўнасць у іх правільных і няправільных варыянтаў адказаў, што не садзейнічае належнай актывізацыі разумовых працэсаў студэнтаў, не пазбаўляе магчымасці запамінання няправільных меркаванняў і механічнага выдзялення лічбаў і літар у тэставых заданнях. Як адзін з недахопаў тэсціравання варта разглядаць арыентацыю тэстаў на праверку лінгвістычнай і моўнай кампетэнцыі, у той час як камунікатыўныя веды, уменні і навыкі застаюцца па-за ўвагай выкладчыка, або ступень іх фарміраванасці правяраецца толькі на ўзроўні тэорыі тэксту.

Такім чынам, хоць тэст і трывала замацаваўся ў практыцы навучання студэнтаў-філолагаў, ён, безумоўна, пакуль што не можа замяніць такія сродкі кантролю, як экзамен, залік, калёквіум. Аднак сістэматычнае выкарыстанне тэстаў розных тыпаў (у залежнасці ад этапаў навучальнага працэсу і зместу вучэбнага матэрыялу) як сродку кантролю і дыягностыкі ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў павышае матывацыю навучання і садзейнічае эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу.

*Літаратура:*

1. Беспалько В.П. Стандартизация образования: основные идеи и понятия. -- Педагогика. – 1993. -- №5. – С. 16-25

2. Гуцанович С.А., Радьков А.М. Тестирование в обучении математике: диагностико-дидактические основы. – Мозырь: Изд. дом «Белый ветер», 2001.—168с.

3. Дроботова Е.В. Педагогический профессионализм как фактор эффективности тестирования// Контроль в обучении иностанному языку: тестирование. Матер.семинара учит. ср. школ Полоцкого р-на. Март 1999г. Новополоцк, 1999. С.13-14

4. Майоров А.Н. Теория и практика создания тестов для системы образования. (Как выбирать, создавать и использовать тесты для целей образования). – М., 2000. – 352с.

5. Молош Н.К. Тестирование на занятиях по иностанному языку. Мн., 2001. – 55с.